ЗАЦВЕРДЖАНА
Намеснік дырэктара
дзяржаўнай установы
культуры змешанага тыпу
«Рэспубліканскі цэнтр
нацыянальных культур»
_______________В.Б.Хачкова
«16» студзеня 2026 г.

**Палажэнне аб правядзенні адкрытага літаратурнага конкурсу «Ліецца ад сэрца родная мова»**

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Адкрыты літаратурны конкурс «**Ліецца ад сэрца родная мова**» (далей – конкурс) праводзіцца дзяржаўнай установай культуры змешанага тыпу «Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур» (далей – Цэнтр) у анлайн-фармаце.

1.2. Дадзены дакумент вызначае мэты і парадак правядзення конкурсу, яго ўдзельнікаў, парадак падвядзення вынікаў і ўзнагароджання пераможцаў.

1.3. Конкурс накіраваны на захаванне і папулярызацыю беларускай мовы і спадчыны беларускай літаратуры, раскрыццё духоўных каштоўнасцей, а таксама прысвечаны Міжнароднаму дню роднай мовы і юбілейным датам беларускай літаратуры.

1.4. Задачы конкурсу:

– Аб’яднанне беларусаў замежжа агульнай ідэяй: дэманстрацыя важнасці захавання роднай мовы як сродку вызначэння нацыянальнай ідэнтычнасці і культурнай самасвядомасці;

– прасоўванне беларускай мовы і літаратуры сярод прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, якія пражываюць у Беларусі і нацыянальна-культурных грамадскіх аб’яднанняў, зарэгістраваных у рэспубліцы;

– папулярызацыя творчай спадчыны класікаў беларускай літаратуры з удзяленнем асаблівай увагі памятным датам у беларускай літаратуры;

– захаванне і прымнажэнне культурных, эстэтычных і духоўных каштоўнасцей;

– садзейнічанне развіццю творчага патэнцыялу і раскрыццю індывідуальных здольнасцей удзельнікаў конкурсу;

– фарміраванне навыкаў публічнага выступлення, развіццё артыстычнасці і выразнасці маўлення.

**2. Умовы правядзення конкурсу**

2.1. Выступленне ўдзельніка ўяўляе сабой выразнае чытанне літаратурных твораў беларускіх аўтараў **выключна на беларускай мове**.

2.2. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца прадстаўнікі *зарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа і нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў, якія дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь, а таксама прадстаўнікі дыяспар, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі*.

2.3. *Ад аднаго ўдзельніка прымаецца не больш за **3 (тры)** відэароліка.*

2.4. Арганізатары маюць права дэманстраваць дасланыя відэаматэрыялы на інфармацыйных рэсурсах Цэнтра (сайт, сацыяльныя сеткі).

**3. Журы конкурсу**

3.1. Для адбору і правядзення экспертнай ацэнкі работ удзельнікаў фарміруецца Журы конкурсу. Яго персанальны склад зацвярджаецца намеснікам дырэктара Цэнтра. Праца ў складзе Журы конкурсу не аплачваецца.

3.2. Журы падводзіць вынікі і вызначае пераможцаў конкурсу, у адпаведнасці з умовамі і крытэрыямі адзнакі.

3.3. Старшынёй Журы конкурсу з'яўляецца намеснік дырэктара Цэнтра.

3.4. Журы конкурсу мае права прызначаць спецыяльныя прызы, адзначаць лепшыя асобныя нумары конкурсу, прымаць рашэнне аб раздзяленні прызавога месца.

**4. Парадак і ўмовы правядзення конкурсу**

4.1. Конкурс праводзіцца ў анлайн-фармаце.

4.2. На конкурс прымаюцца відэазапісы або спасылкі на відэа працягласцю **да 5 хвілін** без элементаў мантажу і дубляў добрай якасці, **фарматаў AVI/DVD/MP4**. На запісе не павінна быць старонніх шумоў, усе фразы павінны быць выразна чутныя.

4.3. Матэрыялы для конкурсу прымаюцца на электронную пошту *centr@nationalcultures.by*.

4.4. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна абавязкова запоўніць заяўку згодна з устаноўленай формай (Дадатак 1).

4.5. Конкурсныя матэрыялы прымаюцца **з 19 студзеня па 13 лютага 2026 года** ўключна.

4.6. Вынікі конкурсу будуць праведзены з 19 лютага па 20 лютага 2026 года.

**5. Намінацыі конкурсу**

***I. «Голас Бацькаўшчыны»***

Відэаматэрыялы з прадэкламаваным творам або ўрыўкам твора любога літаратурнага жанру аўтарства беларускіх паэтаў і пісьменнікаў ад **прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа.**

***II. «Натхненне другой Радзімай»***

Відэаматэрыялы з прадэкламаваным творам або ўрыўкам твора любога літаратурнага жанру аўтарства беларускіх паэтаў і пісьменнікаў

ад **<u>прадстаўнікоў нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў і прадстаўнікоў дыяспар, якія пражываюць у Беларусі.</u>**

*III. «Літаратурные скарбы зямлі беларускай»*

Відэаматэрыялы з прадэкламаваным творам або ўрыўкам твора **<u>беларускіх аўтараў-юбіляраў 2026 года</u>**:

- Іван Мележ (105 гадоў з дня нараджэння);
- Іван Шамякін (105 гадоў з дня нараджэння);
- Васіль Вітка (115 гадоў з дня нараджэння);
- Кандрат Крапіва (130 гадоў з дня нараджэння);
- Максім Багдановіч (135 гадоў з дня нараджэння);
- Змітрок Бядуля (140 гадоў з дня нараджэння).

**6. Вызначэнне пераможцаў конкурсу і іх узнагароджанне**

6.1. Творы для ўдзелу ў конкурсе ацэньваюцца Журы конкурсу па наступных крытэрыях:

- узровень выканальніцкага майстэрства, здольнасць эмацыйна ўздзейнічаць на слухача;
- тэхніка і культура маўлення;
- мастацкая цэласнасць выканання;
- яркасць выканальніцкай індывідуальнасці.

6.2. Журы конкурсу вызначае пераможцаў не пазней за 20 лютага 2026 года.

6.3. Рашэнне па вызначэнні пераможцаў конкурсу журы прымае шляхам адкрытага галасавання па 10-бальнай шкале і афармляецца пратаколам. У выпадку роўнасці галасоў, а таксама ўзнікнення спрэчных сітуацый, правам вырашальнага голасу валодае Старшыня Журы конкурсу.

6.4. Дадзеным Палажэннем вызначаюцца Гран-пры конкурсу і 3 прызавыя месцы (першае, другое і трэцяе месцы) па кожнай намінацыі. Пераможцамі і прызёрамі конкурсу прызнаюцца ўдзельнікі, якія набралі найбольшую колькасць балаў.

6.5. Дыпломы пераможцаў і памятныя прызы ад Журы конкурсу ўручаюцца ўдзельнікам, якія занялі Гран-пры, а таксама першае, другое і трэцяе месцы конкурсу. Прыз не можа быць заменены грашовымі сродкамі або іншым відам заахвочвання.

6.6. Інфармацыя аб выніках правядзення конкурсу і яго пераможцах будзе размешчана на сайце ***<u>https://nationalcultures.by/</u>*** і іншых інфармацыйных рэсурсах Цэнтра <u>не пазней за 27 лютага 2026 года</u>.

**7. Кантактная інфармацыя**

Дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу «Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур»

220029, г. Мінск, вул. Чычэрына, 19.

тэл. +375 17 395 96 03

E-mail: **<u>centr@nationalcultures.by</u>**

**Дадатак 1**
да Палажэння аб правядзенні адкрытага літаратурнага конкурсу «Ліецца ад сэрца родная мова»

**Заяўка**
**на ўдзел у адкрытым літаратурным конкурсе**
**«Ліецца ад сэрца родная мова»**

| **Намінацыя** | |
|---|---|
| Звесткі аб грамадскім аб'яднанні | |
| Назва грамадскага аб'яднання | |
| Краіна, горад | |
| Адрас | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку Старшыні аб'яднання | |
| Email аб'яднання | |
| Кантактны нумар тэлефона Старшыні аб'яднання | |
| Звесткі аб удзельніку | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка | |
| Дата нараджэння ўдзельніка | |
| Кантактны нумар тэлефона ўдзельніка з указаннем месэнджэра для сувязі (Viber/WhatsApp/Telegram) | |
| Звесткі аб конкурсным матэрыяле | |
| Аўтар твора | |
| Назва твора | |